3. Запрудскі, М.І. Сучасныя школьныя тэхналогіі – 3 / М.І. Запрудскі. – Мінск, 2017. – 168 с.

4. Зельманава, Л.М. Нагляднасць у выкладанні рускай мовы: дапаможнік для настаўніка / Л.М. Зельманава. – Масква: Асвета, 1984. – 159 с.

5. Педагагічная энцыклапедыя: у 6 т. / Ф.М. Пятроў [і інш.]. – Масква: Савецкая Энцыклапедыя, 1968. – Т. 4. Сн – Я. – С. 230 6. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 5. Кн. 1. С–У / [Рэд. тома М.Р. Суднік]. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1982. – С. 456.

*Дата поступления в редакцию: 13.11.2022*

# АРГАНІЗАЦЫЯ ЛЕКСІЧНАЙ РАБОТЫ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў I–IV КЛАСАХ

*Пачтарова Вольга Васільеўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле прадстаўлены этапы работы па засваенні вучнямі пачатковых класаў беларускай мовы. Прыводзяцца прыклады практычных заданняў для пашырэння лексічнага запасу вучняў па асноўных вывучаемых тэмах.*

Галоўнай мэтай навучання беларускай мове ў I–IV класах з'яўляецца авалоданне навучэнцамі камунікатыўнымі ўменнямі і навыкамі, неабходнымі для эфектыўнага выкарыстання мовы ў розных сітуацыях зносін, развіццё іх творчага патэнцыялу, далучэнне праз мову да культурных традыцый беларускага народа.

З першага класа вучні вывучаюць беларускую і рускую мовы. Падабенства дзвюх моў садзейнічае разуменню пры авалоданні беларускай мовай, але пры аднаўленні беларускага маўлення, ужыванні беларускай лексікі, якая адрозніваецца па гучанні ад рускай, узнікаюць цяжкасці. Вучань павінен у першую чаргу авалодаць пэўным лексічным запасам. Але для паспяховага авалодання беларускай мовай неабходна арганізаваць сістэмную работу не толькі па засваенні лексікі, але і па ўключэнні яе ў актыўную мову вучняў.

Пры вывучэнні асобных ізаляваных набораў лексікі вучні сутыкаюцца з праблемай ужывання вывучаных слоў у мове, граматычнай сувязі вывучанай лексікі з іншымі словамі. Таму праца ў дадзеным накірунку павінна ўключаць некалькі этапаў, якія заснаваны на дзеяннях са словамі, а не на механічным завучванні.

**Этап 1: знаёмства з новымі словамі.**

Важна ўводзіць новыя словы цэлымі тэматычнымі групамі. Лепш, калі словы будуць звязаны асацыяцыямі, канкрэтнай сітуацыяй ( відэлец-лыжка-кожа-талерка-смачны....), ці наадварот будуць прадстаўляць супроцьлеглыя паняцці (сябар-вораг, добры-дрэнны...). У набор лексікі трэбы ўключыць словы-прадметы, прыкметы, дзеянні (вочы-вялікія,блакітныя-заплюшчыў, міргае), бо слова не існуе ізалявана, яно павінна суадносіцца з іншымі словамі.

**Этап 2: запамінанне новых слоў.**

Важна не задаваць вучням “вывучыць словы”. Новая лексіка павінна ўвайсці ў мову вучня з дапамогай спецыяльных практыкаванняў. Найбольш распаўсюджаныя сярод іх: пераклад, падбор сінонімаў і антонімаў, этымалагічны аналіз, разуменне праз кантэкст, падбор падыходзячых па сэнсе слоў, тлумачэнне значэння, выкарыстанне малюнкаў, мімікі і жэстаў.

**Этап 3: уключэнне новай лексікі ў маўленне, сувязь з раней вывучанай лексікай.**

Важна адразу пасля ўвядзення новых слоў адразу пераходзіць да дзеянняў з імі. Гэта павінны быць прадуктыўныя віды маўленчай дзейнасці: пісьмо, гаварэнне, пераклад, выпраўленне маўленчых памылак.

Прыводзім прыклады заданняў па ўвядзенні, запамінанні і ўключэнні беларускай лексікі ў маўленне вучняў. Такія заданні можна выкарыстоўваць у I класе на ўроках беларускай мовы пры вывучэнні тэматычных груп лексікі, а таксама ў далейшым для пашырэння слоўнікавага запасу вучняў, замацавання вывучанай лексікі і ўмення ўжываць яе ў канкрэтных маўленчых сітуацыях.

**Тэма. Я і мая школа. Школьныя памяшканні.**

*Словы для азнаямлення і даведак пры выкананні заданняў.*

| Рэчы | Памяшканні | Дзеянні |
|---|---|---|
| Дошка – доска<br>Шафа – шкаф<br>Крэйда – мел<br>Анучка – тряпка<br>Кветкі – цветы<br>Паліца – полка | Калідор<br>Бібліятэка<br>Спартыўная зала<br>Клас | Наведваць – посещать<br>Вучыцца – учиться<br>Гуляць – играть<br>Займацца – заниматься |

***Заданні.***

1. На малюнку абвядзі крэйду чырвоным, анучкі сінім, кветку зялёным колерам.



2. Падкрэслі словы, напісаныя па-беларуску.
ШАФА ШКАФ ДОШКА ДОСКА

КЛАС КЛАСС КОРИДОР КАЛИДОР

3. Разгледзь малюнак. Адкажы, колькі паліц у шафе?



Адказ ________________________

Прачытай тэкст. Зрабі, каб малюнак шафы адпавядаў тэксту.

*На ніжняй паліцы шафы стаяў вазон з кветкай. На другой паліцы знізу ляжала крэйда і анучка. На трэцяй паліцы размясцілася класная бібліятэка.*

4. Перакладзі на рускую мову "ВУЧНІ НАВЕДВАЮЦЬ БІБЛІЯТЭКУ".

А) Ученики знают, где библиотека.

Б) Дети обедают в библиотеке.

В) Ученики посещают библиотеку.

5. Перакладзі на беларускую мову "МЫ ПРОТИРАЕМ КРАСКИ ТРЯПКОЙ".

А) Мы праціраем шафу фарбай.

Б) Мы праціраем фарбы анучкай.

В) Мы праціраем фарбы гумкай.

6. Закончы сказ, выбраўшы словы, якія падыходзяць па сэнсе.

Дзяжурны палівае (кветкі, крэйду, анучку).

Настаўнік піша на (дошцы, шафе, крэйдзе).

На перапынку вучні гуляюць у (калідоры, бібліятэцы).

7. Замяні рускае слова на беларускае.

Вучні занимаются фізічнай культурай у спартыўнай зале.

У класе кветкі стаяць на шкафу.

Вучань піша мелом на дошцы.

Вучні учатся у класе.

8. З якімі словамі спалучаюцца словы-дзеянні? Падкрэслі.

Наведваць (бібліятэку, шафу, спартыўную залу, кветку)

Гуляць у (класе, калідоры, спартыўнай зале, крэйдзе)

9. Адкажы на пытанні.

Чым можна пісаць на дошцы?________

Чым можна сцерці напісанае з дошкі? _________

Дзе захоўваюцца кнігі ў бібліятэцы? ____________

Дзе вучні гуляюць на перапынку?_______________

**Тэма. Я і мая сям'я. Адзенне і абутак.**

*Словы для азнаямлення і даведак пры выкананні заданняў.*

| Рэчы | Прыкметы | Дзеянні |
|---|---|---|
| Штаны – брюки<br>Спадніца – юбка<br>Сукенка – платье<br>Кашуля – рубашка<br>Паліто – пальто<br>Камізэлька – жилет<br>Гузік – пуговица<br>Кішэня– карман<br>Каўнер – воротник<br>Капялюш – шляпа<br>Хустка – платок<br>Чаравікі – туфли<br>Боты – сапоги | Антонімы:<br>Доўгі – кароткі<br>Брудны – чысты<br>Стары – новы<br>Мужчынская – жаночая<br>Святочная – паўсядзённая<br><br>Па матэрыялу (пераклад):<br>Шарсцяная – шерстяная<br>Шаўковая – шёлковая<br>Бавоўняная – хлопчатобумажная | Апранаць – одевать<br>Купляць, набываць – покупать<br>Прасаваць – утюжить<br>Мыць – стирать<br>Зашпіліць – застегнуть |

***Заданні.***

1. Спалучы словы і малюнкі.





_______________ _______________





_______________ _______________





_______________ _______________

СУКЕНКА КАШУЛЯ КАМІЗЭЛЬКА
КАПЯЛЮШ ХУСТКА СПАДНІЦА

2. Расфарбуй у сукенкі кішэні ў чырвоны колер, каўнер у зялёны колер, гузікі ў сіні колер.



Адкажы на пытанні:

*Колькі на сукенцы кішэняў?*

☐

*Колькі на сукенцы гузікаў?*

☐

3. Выберы і падкрэслі падыходзячыя словы для адказаў. Выкарыстоўваючы словы пытання і выбраныя словы, пабудуй поўныя адказы.

Што можна купіць у магазіне абутку? *(Чаравікі, капялюш, сукенку, боты)*

Што ты апранеш на галаву, калі пячэ сонца? *(Каўнер, капялюш, кішэню)*

Куды ты пакладзеш насоўку? *(У каўнер, у чаравік, у кішэню)*

На што зашпіляецца кашуля? *(На кішэні, на гузікі, на хусткі)*

Якую частку паліто мы падымаем, калі на вуліцы моцны вецер? *(Каўнер, боты, капялюш, кішэню)*

4. Выберы адзенне і абутак для хлопчыка і дзяўчынкі.

Дзяўчынка апране на свята шаўковую ……………………… і модныя …………. Хлопчык апране на свята баваўняную ………………., шарсцяныя………………………, чыстыя ……………………….

5. Падкрэслі назвы галаўных убораў.

КАШУЛЯ КАПЯЛЮШ СУКЕНКА ХУСТКА КАЎНЕР

6. Падкрэслі назвы адзення, якія можна ўставіць на месцы пропуску.

Мы купілі баваўняную ____________ з кішэнямі. *(Сукенка, хустка, спадніца, кушуля, каўнер, чаравікі)*

7. Выберы правільны пераклад сказа.

У КІШЭНІ СПАДНІЦЫ ЛЯЖЫЦЬ НАСОЎКА.

А) В кошельке сестрички лежат деньги.
Б) В кармане юбки лежит носовой платок.
В) В красивой сумке лежит платок.

8. Спалучы паміж сабой словы, прадметы і дзеянні.

| | |
|---|---|
| Апрануць | чаравікі |
| Прасаваць | кашулю |
| Зашпіліць | хустку |

9. Устаў у сказы словы-прыкметы.

Маці збіраецца мыць __________ кашулю.

__________ спадніца прыкрывала чаравікі прынцэсы.

У аддзеле ____________адзення можна набыць кашулі, штаны і гальштукі.

_________ сукенку Маша апране на дзень нараджэння, а _________ сукенку будзе насіць кожны дзень у школу.

### Тэма. Мае сваякі.

*Словы для азнаямлення і даведак пры выкананні заданняў.*

| Рэчы | Прыкметы | Дзеянні |
|---|---|---|
| Сваякі – родственники<br>Маці, матуля – мама<br>Тата, бацька – папа<br>Бацькі – родители<br>Бабуля – бабушка<br>Дзядуля – дедушка<br>Дачка – дочь<br>Унук і унучка – внук, внучка<br>Немаўляты – младенцы | Старэйшы – старший<br>Малодшы – младший<br>Маленькі – маленький<br>Дарослы – взрослый | Дапамагаць – помогать<br>Ганарыцца – гордиться<br>Клапаціцца – заботиться<br>Сябраваць – дружить<br>Даглядаць – ухаживать<br>Шанаваць – уважать |

***Заданні.***

1. Расстаў лічбы ад самага малодшага да самага старэйшага ў сям'і.

| Бабуля | Дачка-немаўля | Бацькі |
|---|---|---|
| ☐ | ☐ | ☐ |

2. Дапішы членаў сям'і.

____________ старэйшая за маці.
____________старэйшы за бацьку.
____________самыя малодшыя ў сям'і.
_____________– гэта дарослыя.

3. Адкажы на пытанні, гледзячы на малюнак.



Што робіць бабуля?
Хто размаўляе па тэлефону?
Колькі чалавек у сям'і?
Ці ёсць у сям'і немаўляты?
Хто сядзіць побач з татам?
Хто з дзяцей у сям'і малодшы?

4. Перакладзі сказ на рускую мову.

Бацькі вучаць старэйшых дзяцей даглядаць за малодшымі.

5. Выберы правільны варыянт перакладу на рускую мову прапанаванага сказа.

Нашы бацькі сябруюць са сваімі сваякамі.

А) Наш папа дружит со своими сёстрами.
Б) Наши родители дружат со своими родственниками
В) Наши отцы служат со своими родителями.

6. Устаў словы-дзеянні з трэццяга слупка, падыходзячыя па сэнсу.

Старэйшыя будуць ________________пра малодшых.

Дзеці павінны ________________ дарослым.

Дзядуля ________________ добрым унукам.

Унукі ____________________ бабулю і дзядулю.

7. Прачытай прыказкі. Падкрэслі словы, якія абазначаюць сваякоў. Растлумач сэнс прыказак.

*Няма лепшага сябра, чым родная маці.*

*Хто бацькоў шануе, той ніколі не згіне.*

*Не навучыць бацька, дык навучыць гора.*

8. Хто каму кім прыходзіцца? Запішы.

Бацька твайго таты – табе __________________

Маці твайго бацькі – табе __________________

Твой малодшы брат для тваёй бабулі ______________

Твай бацькі для бабулі і дзядулі ________________

**Тэма. Мая кватэра.**

*Словы для азнаямлення і даведак пры выкананні заданняў.*

| Рэчы | Прыкметы | Дзеянні |
|---|---|---|
| Крэсла – кресло<br>Тэлевізар – телевизор<br>Пакой – комната<br>Падлога – пол<br>Ложак – кровать<br>Канапа – диван<br>Шафа – шкаф<br>Дыван – ковёр<br>Люстэрка – зеркало<br>Столь – потолок | Вялікі – большой<br>Стракаты – пёстрый<br>Драўляны – деревянный<br>Утульны – уютный<br>Пісьмовы – письменный<br>Бліскучы – блестящий | Прыбіраць<br>Рамантаваць<br>Пыласосіць |

***Заданні.***

1. Дапоўні малюнак.



1. Жоўтым колерам расфарбуй канапу.
2. На дыване намалюй мышку.
3. На столі намалюй кветку.
4. На падлозе намалюй мяч.
5. На люстэрку намалюй павуцінку.

2. Абвядзі ложак.



3. Складзі са слоў сказ . Запішы сказ.

ТАТА ДЫВАН ПЫЛАСОСІЦЬ ПАКОІ Ў ВЯЛІКІМ СТРАКТЫ

______________________________________________

4. Падкрэслі назвы рэчаў, якія могуць быць драўлянымі.

ПАДЛОГА ЛОЖАК ДЫВАН КАНАПА ШАФА ЛЮСТЭРКА

5. Спалучы словы – прыкметы і словы прадметы.

| | |
|---|---|
| Утульная | пакой |
| Вялікі | кватэра |
| Мяккая | дыван |
| Пушысты | канапа |
| Пісьмовы | столь |
| Высокая | стол |

6. Дапоўні тэкст пра кватэру словамі, якія падыходзяць па сэнсу.

У нашай __________ чатыры пакоі. У маім _________ стаіць пісьмовы стол, шафа і ложак. На ______________ пасцялілі новы стракаты дыван. На _____________ гарыць лямпачкамі бліскучая люстра. У _________ я складваю сваё адзенне. На ___________ ляжаць мяккія падушкі . Мой пакой вельмі ______________________ .

*Словы для даведак: утульны, кватэра, пакой, ложак, столь, падлога.*

7. Знайдзі у сказах рускае слова і замяні яго на беларускае.

Тата рамантуе ў вялікім пакоі телевизор.

Пасярод пакоя стаяў уютный ложак.

Маша не памыла пол пад дываном.

8. Выберы і запішы правільны варыянт перакладу для прапанаванага сказа.

В БАБУШКИНОЙ КОМНАТЕ НА КОВРЕ СТОЯЛ БОЛЬШОЙ ДИВАН.

______________________________________________

А) У бабулінай кватэры на каўры стаяў вялікі дыван.

Б) У бабуліным пакоі на дыване стаяла вялікая канапа.

В) У бабуліным пакоі на канапе стаяў вялікі дыван.

Г) У бабуліным пакоі на дыване стаяў утульны ложак.

**Тэма. Знешні выгляд. Асабістая гігіена.**

*Словы для азнаямлення і даведак пры выкананні заданняў.*

| Рэчы | Прыкметы | Дзеянні |
|---|---|---|
| Шыя – шея<br>Твар – лицо<br>Вочы – глаза<br>вушы – уши<br>вусны – губы<br>валасы – волосы<br>далоні – ладони<br>расческа – расчёска<br>насоўка – носовой платок<br>ручнік – полотенце | Брудны – грязный<br>Чысты – чистый<br>доўгі – длинный<br>бліскучы – блестящий<br>стараны – старательный | Мыюся – моюсь<br>Мыю – мою<br>Усміхаюся – улыбаюсь<br>Чышчу – чищу<br>Трымаю – держу |

| | | |
|---|---|---|
| шчотка – щётка<br>чысціня – чистота | | |

***Заданні.***

1. На малюнку укажы стрэлкамі часткі твару.



ВАЛАСЫ ВОЧЫ ВУСНЫ ШЫЯ ТВАР ДАЛОНІ

Якое слова лішняе? Чаму?

2. Назаві ласкава па ўзоры: насы – носікі, ногі – ножкі.

Вочы – ___________________

Вушы – ___________________

Твар – ____________________

Далоні – ___________________

Шыя – _____________________

3. Выберы і абвядзі на малюнках НАСОЎКУ.







4. Выберы і абвядзі на малюнках РУЧНІКІ.







5. Апішы сябе. Дадай словы, якіх не хапае.

У мяне ___________ валасы, ______________ вочы і ___________ вусны.

6. Складзі сказы па ўзоры пра розныя часткі цела.

*Узор: Я старанна мыю брудныя рукі.*

Я старанна мыю ……………………………..

7. Запішы, якія прадметы неабходны для гігіены розных частак цела. Не забывай мяняць форму слова ў сказе.

Твар і далоні я выціраю ___________________

Зубы я чышчу __________________________

Валасы я расчэсваю _____________________

Нос я выціраю __________________________

8. Перакладзі сказы на рускую мову.

Дзяўчынка старанна чысціла зубы і ўсміхалася.

Хлопчык старанна мыў брудныя далоні.

Бабуля працёрла бліскучае люстэрка ручніком.

9. Перакладзі сказ на беларускую мову.

МАМА СТЁРЛА С ГРЯЗНОГО ЛИЧИКА ДОЧКИ СЛЁЗЫ НОСОВЫМ ПЛАТКОМ И ДЕВОЧКА УЛЫБНУЛАСЬ.

10. Раскажы, гледзячы на малюнкі, хто і што трымае ў руках.







11. Замяні ў сказах рускае слова ЧИСТОТА на беларускае.

ЧИСТОТА – залог здароўя.

З ЧИСТОТЫ пачынаецца здароўе.

ЧИСТОТА – лепшая прыгажосць.

Ці згодны ты з гэтымі выказваннямі? Паразважай.

*Дата поступления в редакцию: 21.11.2022*

# ФОРМИРОВАНИЕ КОММУНИКАТИВНОЙ КОМПЕТЕНЦИИ НА УРОКЕ МАТЕМАТИКИ

*Снарская Инна Павловна*

***Аннотация.*** *В публикации рассматривается система работы педагога по формированию коммуникативной компетенции учащихся на уроке математики через вовлечение в различные виды деятельности, демонстрируются возможности релизации на различных этапах урока педагогических приемов для формирования устной и письменной математической речи как составляющей коммуникативной компетенции.*

В современных условиях большинство детей при выборе вариантов проведения свободного времени отдают предпочтение активности и иллюзии активности виртуального мира, а не реального. Интерес к учению ослабевает и утрачивается с каждым годом все стремительнее. Навыки живой коммуникации сводятся к нулю, наблюдается значительное снижение уровня культуры речи учащихся. А одним из требований современного образования является формирование личности, способной проанализировать информацию в тексте и сформулировать собственное речевое высказывание для дальнейшего его применения на